

ЯК У БЕЛАРУСІ ІГОЛКАМІ ЛЕЧАЦЬ 5

ЗНІКЛЫ БЕЗ ВЕСТАК – ЗНОЙДЗЕНЫ 6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

19 ЧЭРВЕНЯ 2019 г. СЕРАДА

№ 113 (28980)

ЗВЯЗДА

ЗБЛІЖАЮЧЫ КАНТЫНЕНТЫ

Прэзідэнты Беларусі і Егіпта абмеркавалі ўсе аспекты двухбаковых адносін

Абдэль Фатах ас-Сісі — лідар Егіпта — прыляцеў у нашу краіну яшчэ 17 чэрвеня, у першы дзень візіту ён сустрэўся з прэм'ер-міністрам Беларусі і кіраўнікамі буйных беларускіх прадпрыемстваў.

А ўчора на самым высокім узроўні Абдэль Фатаха ас-Сісі з усёй пашанай прынялі ў Палацы Незалежнасці. Пасля выканання гімнаў кіраўнікі дзяржаў павіталі членаў дэлегацый, затым адбылася цырымонія фатаграфавання, а потым яны адправіліся на перагаворы, за ходам якіх прасачылі нашы карэспандэнты.



Фота БелТА.

ПААБЯЦАЛІ — ВЫКАНАЕМ

Спачатку адбыліся афіцыйныя перагаворы беларускага і егіпецкага лідараў у вузкім складзе.

Прэзідэнт вялікай паўночнаафрыканскай краіны ўпершыню за час двухбаковых адносін прыехаў у Беларусь, і невыпадкова Аляксандр Лукашэнка, вітаючы свайго егіпецкага калегу, назваў яго візіт гістарычным. Гэта годны працяг наладжаных раней канструктыўных сувязяў. Беларускі лідар нагадаў, што бакі намецілі план дзеянняў падчас яго візіту ў Егіпет у 2017-м. «Павінен сказаць, што мы нямала зрабілі ў плане рэалізацыі гэтых мерапрыемстваў і падвоілі наш тавараабарот. У нас быў ён каля 50 млн долараў, цяпер звыш 100 млн долараў. Гэта добры пачатак, але не мяжа», — падкрэсліў ён.

На яго думку, наладзіць маштабнае ўзаемадзеянне паміж дзяржавамі ў сучасную эпоху вельмі складана. Прычыны розныя: рынкі занятыя, партнёрскія адносіны склаліся даўно, яны стабільныя. Нягледзячы на гэтыя складанасці, Беларусі і Егіпту ўдалося іх пераадолець, упэўнены кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт Беларусі запэўніў свайго калегу, што ўсё, пра што бакі дамовіліся, што паабяцалі (як раней, так і ў ходзе гэтага візіту), безумоўна будзе рэалізавана ў намечаныя тэрміны.

У адказ Прэзідэнт Егіпта падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за цёплы прыём і гасціннасць. Паводле яго слоў, усе дамоўленасці, якія былі дасягнуты падчас візіту Прэзідэнта Беларусі ў Егіпет, выконваюцца, іх рэалізацыя будзе працягнутая. Ён дадаў, што ў Егіпта ёсць жаданне пашыраць і ўмацоўваць супрацоўніцтва з Беларуссю.

Ён таксама пагадзіўся з тым, што ўсё, што на цяперашні момант дасягнута, не адпавядае чаканням і памкненням. «Разлічваем, што візіт у Беларусь дасць штуршок ва ўмацаванні і развіцці адносін па ўсіх пытаннях, якія мы будзем абмяркоўваць, — сказаў ён. — Думаю, што падпісанне пагаднення аб стварэнні Дзелавога савета і падпісанне пагаднення аб дарожнай карце таксама будуць спрыяць развіццю нашых адносін».

КРАІНА, ЯКАЯ ЗМАГЛА

Далей прайшла сустрэча лідараў у пашыраным складзе з удзелам членаў дэлегацый.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў Егіпце паспяхова завяршыліся перавтварэнні, асабліва ў палітычным плане, і зроблены важныя крокі да сацыяльна-эканамічнай стабілізацыі, і самае галоўнае — у барацьбе з міжнародным тэрарызмам. Ён звярнуў увагу, што рэгіён ад Афганістана да Судана відавочна дэстабілізаваны, аднак Егіпту ўдалося стрымаць негатыўныя працэсы і ўтрымаць краіну. Кіраўнік дзяржавы павіншаваў прэзідэнта Егіпта з гэтым дасягненнем і тым, што ўдалося выйсці на рэйкі стабільнага развіцця. Гэта важна як для рэгіёна, так і для ўсяго свету.

Паводле яго слоў, Беларусь надае вялікае значэнне развіццю прыязных сувязяў з Егіптам і разглядае гэтую краіну ў якасці найважнейшага партнёра ў рэгіёне Блізкага Усходу і на Афрыканскім кантыненце. Беларускі бок вітае ўзрастаючую ролю Егіпта ў Афрыцы — яе сведчаннем з'яўляецца абранне Прэзідэнта Егіпта старшынёй Афрыканскага саюза.

Беларускі лідар падкрэсліў: паміж нашымі дзяржавамі няма абсалютна ніякіх праблемных пытанняў, няма закрытых тэм для абмеркавання. Пры гэтым важна, што бакі актыўна перайшлі да трансфармацыі дружалюбных палітычных адносін у шматпланавае і выгаднае эканамічнае супрацоўніцтва. І сёння ўжо ёсць адчувальны вынік і сур'ёзны прагрэс на гэтым кірунку, дадаў Прэзідэнт Беларусі.

Акрамя таго, ідзе рэгулярны абмен урадавымі, парламенцкімі і дзелавымі дэлегацыямі. Наконт тавараабароту кіраўнік дзяржавы сказаў, што зараз ён не адпавядае існуючаму патэнцыялу, у нас ёсць усе магчымасці выйсці на больш высокія паказчыкі.

ПРОСТЫ АБМЕН ТАВАРАМІ — ГЭТА АРХАІКА

Кіраўнікі дзяржаў дамовіліся, што бакі прыкладуць усе намаганні для таго, каб ліквідаваць існуючыя бар'еры ў гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве. У прыватнасці, хацелася б мець выразную сістэму рэгістрацыі пастаўшчыкоў беларускай прадукцыі ў Егіпет.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што для павелічэння аб'ёмаў прадукцыі сумеснай вытворчасці патрабуецца стварэнне ўрадам Егіпта роўных умоў па ўдзелу ў тэндарах, размяшчэнні дзяржаўных заказаў на тавары, што вырабляюцца ў рамках сумесных праектаў, аказанне фінансавага садзейнічання прадпрыемствам.

Тое ж самае зробіць і Беларусь са свайго боку.

«Мы разлічваем ствараць разам з вамі прадукт і сумесна забяспечваць яго рэалізацыю, збыт, у тым ліку на знешніх рынках, асабліва на Афрыканскім кантыненце, які мае патрэбу ў сучасных простых і танных таварах, у тым ліку ў сферы машынабудавання. Гэта дазволіць вашай краіне павялічыць экспарт. Такі падыход выгадны як Мінску, так і Каіру», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

Беларусь выступае за свабоднае перамяшчэнне тавараў і падтрымлівае прапанову егіпецкага боку аб заключэнні пагаднення аб свабодным гандлі паміж краінамі — членамі ЕАЭС і Егіптам.

«Спадар Прэзідэнт, мы з вамі дамовіліся аб тым, што будзем пераходзіць да больш сучасных і шматпланавых эканамічных адносін. Работа ў гэтым кірунку ўжо вядзецца. Просты абмен таварамі — гэта несучасны ўзровень», — падкрэсліў беларускі лідар.

УПОР — НА ТЭХНІКУ

У якасці асноўнага метаду нашага ўзаемадзеяння вызначаны праектны падыход. Сучасная і развітая прамысловасць — адзін з моцных бакоў беларускай эканомікі. І мы гатовыя дзяліцца з егіпецкімі партнёрамі ўласнымі прамысловымі тэхналогіямі, паведаміў кіраўнік дзяржавы.

Так, у адпаведнасці з дамоўленасцямі, у Каіры дадзены старт сумеснаму праекту па вытворчасці аўтатэхнікі МАЗ. У 2018 годзе выраблена 72 адзінкі. «Гэта добры пачатак. Важна, спадар Прэзідэнт, на стадыі станаўлення гэтага прадпрыемства падтрымаць гэтую вытворчасць заказамі егіпецкай дзяржавы», — сказаў ён.

СТАР. 2

СВЯТЛО НАД СТАЛІЦАЙ

Сустрэць «Полымя міру» гэтымі днямі можна на вуліцах Мінска

Эстафета агню II Еўрапейскіх гульняў «Полымя міру» стартавала паўтара месяца таму. За гэты час агонь пабываў у самых знакавых мясцінах не толькі нашай краіны. Праз 46 дзён з моманту яе старту ў Рыме эстафета прыбыла ў Мінск.

У панядзелак увечары на плошчы Дзяржаўнага сцяга сустрэча агню была адзначана грандыёзна. Сотні валанцёраў, спартсмены сусветнага ўзроўню, артысты эстрады, дзеячы мастацтва стварылі дзівоснае шоу, напоўненае дынамічнымі танцамі, гульнёй святла і натхняльнымі музычнымі кампазіцыямі. Разам з гасцямі і жыхарамі горада святочным вечарам атрымлівалі асалоду і сотні факеланосцаў папярэдніх этапаў эстафеты, а таксама Зорныя паслы II Еўрапейскіх гульняў.

Учора агонь Гульняў пабываў на праспекце Незалежнасці, на шляху ад Нацыянальнай бібліятэкі да Кастрычніцкай плошчы ў эстафеце прынялі ўдзел каля

З факелам Гульняў — касманаўт Алег НАВІЦКІ.

Фота БелТА.

паўсотні факеланосцаў, кожны з іх нёс факел каля дзвюх хвілін. Стартавала ж з ім ад Нацыянальнай бібліятэкі алімпійская чэмпіёнка Надзея Скардзіна.

А сёння агонь яркіх перамог асвяціць сабой шэраг мінскіх прадпрыемстваў, на заўтра запланавана наведванне паркаў і гарадскіх славутасцяў. Таксама эстафета агню завітае і ў Вёску спартсменаў, каб павітаць удзельнікаў мультыспартыўнага форуму.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Нагадаем, часткай вялікага спартыўнага свята можа стаць кожны беларус. Білеты на спаборніцтвы яшчэ ёсць у продажы. А спецыяльна для нашых чытачоў у гэтым нумары мы падрыхтавалі падрабязны расклад турніру.

СТАР. 8

ЛІЧБА ДНЯ

Каля 244 тысяч турыстаў

з больш чым 70 краін наведалі Беларусь праз Нацыянальны аэрапорт Мінск з пачатку дзеяння Указа № 8 «Аб устанаўленні бязвізавага парадку ўезду і выезду замежных грамадзян». Найбольш замежнікаў прыехала з Германіі — звыш 40 тысяч турыстаў. У дзясятку таксама ўвайшлі Італія (крыху больш за 22 тысячы), Польшча (21,8 тысячы), ЗША (16,8 тысячы), Вялікабрытанія (16,7 тысячы), Францыя (11,39 тысячы), Латвія (каля 8,9 тысячы), Нідэрланды (8,6 тысячы), Швецыя (7,8 тысячы) і Літва (7,1 тысячы).

ЗААЗЕРСКІЯ ЧАЎНЫ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У Беларусі налічваецца дваццаць пяць вёсак з назвай Заазер'е. Толькі ў Сенненскім раёне іх чатыры. Заазер'е ў Багданаўскім сельсавеце гэтага раёна знакаміта тым, што тут жыве і працуе лодачны майстар. На жаль, такіх адмысловых спецыялістаў у краіне засталося няшмат, і таму Уладзіміра Вільчынскага і ў сваім, і ў суседніх раёнах добра ведаюць. У гэтым азёрным краі (у Сенненскім раёне семдзесят шэсць вялікіх і малых азёр) лодка — па-ранейшаму рэч запатрабаваная. Наогул Уладзімір Вільчынскі вельмі цікавы чалавек: і як майстар спраў драўляных — ён робіць бочкі, займаецца разьбой па дрэве, — і як добры пчаляр. Заснаваў аграсядзібу, назваўшы яе Спадчына. За гаспадарліваясць Уладзіміра абралі старастам вёскі. Магчыма, пазней «Звязда» раскажа і пра гэтыя ягоныя таленты і захапленні. А наш фотарэпартаж пра тое, як заазерскі майстар робіць чарговую лодку.

СТАР. 6

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Трамп абвясціў аб масавай дэпартацыі мігрантаў

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп анансаваў маштабную высылку з краіны нелегальных мігрантаў. У сваім твітары амерыканскі лідар паведаміў, што дэпартацыі пачне Імігрыцыйная і мытная паліцыя ЗША (ICE). «На наступным тыдні ICE пачне працэс выправаджэння мільёнаў нелегальных мігрантаў. Яны будуць высланы гэтаксама хутка, як і прыйшлі», — падкрэсліў прэзідэнт ЗША. Акрамя таго, Трамп пахваліў Мексіку, якая выкарыстоўвае строгія міграцыйныя законы. Паводле яго слоў, дзякуючы руплівасці мексіканскіх улад «многіх людзей спыняюць задоўга да нашай [амерыканскай] паўднёвай мяжы». Гватэмала таксама робіць свой унёсак у барацьбу з нелегальнай міграцыяй, адзначыў Трамп, паколькі ўлады краіны збіраюцца падпісаць пагадненне аб даванні прытулку грамадзянам трэціх краін.

Большасць фінаў выказалася супраць уступлення краіны ў НАТА

Большасць жыхароў Фінляндыі не падтрымлівае падачу краінай заяўкі на ўступленне ў НАТА. Пра гэта сведчаць вынікі апытання, праведзенага па замове фінскіх грамадскіх арганізацый сферы абароны, сярод якіх — Саюз рэзервістаў і Саюз афіцэраў рэзерву. «Толькі 14 працэнтаў фінаў хацелі б, каб краіна падала заяўку на ўступленне ў НАТА проста зараз ці ў найбліжэйшыя гады. Адмоўна да далучэння да блока ставяцца 36 працэнтаў апытаных», — адзначаецца ў паведамленні на сайце Саюза рэзервістаў. У той жа час 44 працэнты жыхароў Фінляндыі лічаць

правільным захаваць за краінай магчымасць падаць заяўку ў НАТА. Аднак 36 працэнтаў заявілі, што падтрымліваюць палітыку рэспублікі па недалучэнні да ваенных блокаў. 33 працэнты рэспандэнтаў хацелі б развіваць абароннае вымярэнне ЕС,12 працэнтаў выступаюць за ваенны саюз са Швецыяй.

Аўкцыённы дом Sotheby's пайшоў з малатка

Sotheby's купіў уладальнік медыягрупы Altice, французскі бізнесмен Патрык Драі, перадае Financial Times. Сума здзелкі — 3,7 мільярда долараў. Такім чынам, абодва найстарэйшыя і найбуйнейшыя брытанскія аўкцыённыя дамы — Sotheby's і Christie's — будуць цяпер належаць французскім бізнесменам. Christie's валодае кіраўнік холдынга Kering Францыа Піно. У апошнія гады Sotheby's нёс мільённыя страты і канфліктаваў з акцыянерамі, якія патрабавалі скараціць выдаткі і павысіць дывідэнды. 55-гадоваму Драі належаць адзін з самых папулярных каналаў навін Францыі BFM TV, радыёсетка RMC, газета Liberation, штотыднёвік L'Express, а таксама мабільныя і кабельныя сеткі ў Францыі, Партугаліі, Ізраілі, ЗША. Летась ён апынуўся на 11-м месцы ў спісе найбагацейшых людзей Пятай рэспублікі з капіталам 7,1 мільярда долараў. FT адзначае, што здзелка выгаднай былым уладальнікам і была праведзена на здзіўленне хутка. Сам Патрык Драі назваў найбуйнейшы і найстарэйшы аўкцыённы дом свету «самым элегантным і натхняльным брэндам».

КОРАТКА

• Беларуская сям'я падняла на самы высокі вулкан Азіі сцяг з сімволікай II Еўрапейскіх гульняў.

• У Віцебскай вобласці ад спёкі пацярпела амаль 29 тыс. га пасеваў.

• Facebook плануе выпусціць у абарачэнне ўласную крыптавалюту Libra.

• Беларусь увайшла ў топ-10 найлепшых напрамкаў для гастранамічнага турызму расіян.

Нашы людзі

ЗАМАЦОЎВАЕМСЯ НА КРАЙНІМ ПОЎДНІ

Першая зімоўка на Паўднёвым полюсе можа адбыцца ў 2020 годзе

Агульны стаж працы Аляксея ГАЙДАШОВА за пяцідзясятым градусам паўднёвай шыраты складае ўжо каля 11 гадоў.

«Знаходжанне беларускіх палярнікаў у Антарктыдзе — гэта не вандроўка натуралістаў і не туры для экстрэмалаў, а сур'ёзная і карпатлівая штодзённая навуковая праца, — канстатаваў падчас урачыстага прыёму ў Нацыянальнай акадэміі навук Аляксей ГАЙДАШОЎ, нязменны кіраўнік усіх беларускіх антарктычных экспедыцый, пачынаючы з 2007 года. — Прычым экспедыцыя — гэта толькі бачная вяршыня айсберга. Насамрэч у аснове нашай паспяховай дзейнасці на Паўднёвым полюсе Зямлі ляжыць праца соцень, а, можа быць, і тысяч людзей — непрыкметная і нябачная староннему воку. Вялікія маральныя і псіхалагічныя намаганні выдаткоўваюцца на тое, каб прабіць фінансаванне, новы прыбор, метад даследавання і гэтак далей. Таму ніскі паклон усім, хто ў гэтым удзельнічае».

СТАР. 3

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем цікавае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ – НЕ ПАШКАДУЕЦЕ!

ISSN 1990 - 763X

ЗБЛІЖАЮЧЫ КАНТЫНЕНТЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На думку Прэзідэнта, неабходна даць прадпрыемству магчымасць разгарнуцца і самастойна напрацаваць партфель заказаў. Для стабільнай рэнтабельнасці завод павінен выпускаць не менш як 350—400 адзінак тэхнікі ў год. Са свайго боку Беларусь таксама гатова аказаць падтрымку.

Акрамя таго, шматпрофільнае зборачнае прадпрыемства ў егіпецкай Александрыі павялічвае вытворчасць трактароў «Беларус». Яшчэ ў Каіры створаны зборачныя лініі пагрузчыкаў і сельскагаспадарчага абсталявання.

«Мы азнаёмілі спецыялістаў Міністэрства абароны Егіпта з беларускім вопытам, перадалі асобныя тэхналогіі стварэння цяплічных комплексаў, мяса-малочных фермаў, вытворчасці дзіцячага харчавання, жытняга хлеба, вырошчвання агародніны ў закрытым грунце. Калі ў вас ёсць жаданне выкарыстоўваць беларускі вопыт, мы гатовыя падключацца да вашых праектаў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Зараз Егіпет актыўна рэалізуе нацыянальную праграму па стварэнні цяплічных комплексаў. Для іх патрэбна адпаведная тэхніка — пробная партыя малагабарытных трактароў для прамысловых цяпліц ужо выраблена. Стварацца іх магчыма на сумесным прадпрыемстве ў Александрыі.

Аляксандр Лукашэнка прапанаваў егіпецкім прадпрыемствам разам выпускаць пасажырскую тэхніку, электробусы, трамваі, дызельныя рухавікі, ліфтавае абсталяванне, збожжасховішчы, аўтамабілі спецыяльнага прызначэння.

НЕ ЗАБЫЦЦА ПРА НАВУКУ І АДУКАЦЫЮ

Перспектыўнае для дзвюх краін узаемадзеянне не толькі ў традыцыйных сферах, але і ў сучасных навукова-тэхнічных праектах у галіне высокіх тэхналогій.

«Нашы акадэміі навук ужо працуюць над рэалізацыяй сумесных праектаў. Разлічваем, што вынікі гэтай работы ў хуткай будучыні знойдуць практычнае прымяненне ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы дзвюх краін», — заявіў Прэзідэнт.

Егіпецкаму боку прапанаваны праекты ў галіне электроннага ўрада, лічбавай трансфармацыі, кібербяспекі, камп'ютарных гульняў.

У якасці аднаго з прыярытэтных кірункаў супрацоўніцтва краінамі была абраная сфера адукацыі — гэта галіна непасрэдна звязаная з моладдзю, развіццём яе патэнцыялу, спартыўных і творчых здольнасцяў, прапагандай здаровага ладу жыцця.

«Я ведаю, якую ўвагу, спадар прэзідэнт, вы ўдзяляеце моладзі. Гэта нядзіўна: 60 % насельніцтва Егіпта — гэта маладыя людзі, якія жадаюць быць адукаванымі і мець работу. Мы вітаем вашу ініцыятыву аб правядзенні ў Егіпце штогадовага Сусветнага маладзёжнага форуму. Мы будзем рабіць усё, каб кантакты паміж маладымі людзьмі Егіпта і Беларусі ўзмацняліся і развіваліся. Беларускія прадстаўнікі будуць актыўна ўдзельнічаюць у гэтых мерапрыемствах», — сказаў беларускі лідар.

Ён пацвердзіў і раней накіраванае запрашэнне для групы егіпецкіх падлеткаў прыехаць на аздараўленне ў Беларусь у бягучым годзе.

Але наша краіна можа прапанаваць не толькі цікава і пазнавальна правесці адпачынак, Беларусь валодае значным патэнцыялам у галіне адукацыі, падрыхтоўцы спецыялістаў, запатрабаваных у эканоміцы.

«У цяперашні час у Беларусі праходзяць навучанне ўсяго 20 егіпецкіх грамадзян. Мы выдзелілі адукацыйныя гранты грамадзянам Егіпта на навучанне ў беларускіх ВНУ. Гэта толькі пачатак, мы хацелі бы бачыць вашых маладых людзей, якія імкнуцца атрымаць сучасную адукацыю ў Беларусі ў большай колькасці», — паведаміў Аляксандр Лукашэнка.

ТУРЫСТЫЧНЫЯ ПАТОКІ РАСТУЦЬ

Прэзідэнт Беларусі нагадаў, што два гады назад (падчас афіцыйнага візіту ў Каір) лідары ўжо адзначалі: у справе развіцця дружалюбных адносін паміж двума народамі важнае месца займае турызм.

«За гэтыя апошнія два гады турыстычны паток з Беларусі ў Егіпет павялічыўся больш чым у чатыры разы. Мы, спадар прэзідэнт, хацелі б, каб і вашы людзі часцей бывалі ў Беларусі. Як вы сёння сказалі: «У Беларусі для егіпецкіх грамадзян ёсць, што паглядзець». А мы створым усе ўмовы для таго, каб грамадзяне Егіпта атрымалі тут усё неабходнае, прыехаўшы на адпачынак», — дадаў ён.

І Беларусь, і Егіпет валодаюць багатай культурнай і гістарычнай спадчынай. Кіраўнік дзяржавы адзначыў зацікаўленасць у абмене вопытам у гэтай сферы, а таксама гатоўнасць арганізаваць узаемныя візіты спецыялістаў музеяў, археолагаў, рэстаўратараў, правесці ў сябе Дні культуры Егіпта.

«Мы заўсёды гатовыя да адкрытага дыялогу, абмеркавання актуальных пытанняў супрацоўніцтва ў інтарэсах народаў нашых краін», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

ВЫНІКІ — ПЛЁННЫЯ

Па выніках перагавораў Аляксандр Лукашэнка і Абдэль Фатах ас-Сісі звярнуліся да прадстаўнікоў СМІ з заявамі.

«Вынікі перагавораў ацэньваю як плённыя — супрацоўніцтва паміж краінамі развіваецца, у апошнія два гады адзначана значная дынаміка па многіх кірунках. Егіпет быў і застаецца для нас важным і надзейным партнёрам у Афрыцы і на Блізкім Усходзе», — сказаў беларускі лідар.

Беларусь імкнецца ўмацоўваць адносіны з афіцыйным Каірам на прынцыпах раўнапраўя, узаемнай павагі і даверу. «З Прэзідэнтам Егіпта мы адкрыта абмеркавалі сучасную геапалітычную сітуацыю», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка, адзначыўшы падабенства падыходаў па важнейшых пытаннях глабальнага парадку дня.

Асноўную ўвагу падчас сустрэчы лідары ўдзялілі гандлёва-эканамічным адносінам, прааналізавалі выкананне даручэнняў, ход рэалізацыі сумесных праектаў. «З упэўненасцю магу сказаць пра тое, што нашы дамоўленасці выконваюцца. І беларускія, і егіпецкія ведамствы сапраўды прыкладаюць намаганні для рэалізацыі адзначанага», — заявіў Прэзідэнт Беларусі.

Беларусь і Егіпет імкнуцца прыйсці да больш сучасных і шматпланавых эканамічных адносін. Краіны зацікаўлены ў рэалізацыі комплексных праектаў па прасоўванні беларускай высокатэхналагічнай прадукцыі ў Егіпет, у стварэнні сумесных прадпрыемстваў з высокай ступенню лакалізацыі і арганізацыі збыту выраблена прадукцыі і ў трэціх краінах.

Беларускі бок спадзяецца на больш хуткае падпісанне пагаднення аб свабодным гандлі паміж ЕАЭС і Егіптам.

«Патэнцыял супрацоўніцтва ў нашых краін вялікі. Беларусь уваходзіць у Еўразійскі эканамічны саюз. Егіпет з'яўляецца ўдзельнікам шматлікіх інтэграцыйных аб'яднанняў, перш за ўсё ў Афрыцы. Нам ёсць што прапанаваць гэтаму рэгіёну. Таму неабходна і далей працаваць сумесна, стварацца сумесныя прадукты для іх рэалізацыі як у Афрыцы, так і ў Еўразіі», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

Егіпецкія спецыялісты азнаёміліся з беларускімі тэхналогіямі процідзеяння кіберпагрозам і забеспячэння бяспекі пры правядзенні масавых спартыўных мерапрыемстваў, у тым ліку ў рамках падрыхтоўкі да Другіх Еўрапейскіх гульняў. Беларусы правялі навучальны курс у галіне дызайну і вытворчасці мэблі для егіпецкіх калег. Усё гэта зроблена за два з невялікім гады.

У сваю чаргу прэзідэнт Егіпта Абдэль Фатах ас-Сісі ўпэўнены, што яго візіт у Беларусь надасць новы імпульс супрацоўніцтву дзвюх краін.

«Мы правялі сёння вельмі грунтоўныя перагаворы, у ходзе якіх абмеркавалі шляхі ўмацавання ўсіх аспектаў двухбаковых адносін. Адбыўся абмен думкамі па актуальных пытаннях, якія прадстаўляюць сумесны інтарэс, пацвердзілі наша агульнае жаданне ўмацаваць і пашырыць супрацоўніцтва паміж намі. Мы гаварылі таксама аб міжкультурным складніку двухбаковых адносін і міжпарламенцкіх сувязях паміж нашымі краінамі», — паведаміў прэзідэнт Егіпта.

Абдэль Фатах ас-Сісі павіншаваў Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнку з правядзеннем Другіх Еўрапейскіх гульняў, якія, на яго думку, з'яўляюцца паказчыкам высокага аўтарытэту Беларусі ў Еўропе.

«Абмеркаваны таксама магчымасці плённага супрацоўніцтва ў сферы турызму, узаемадзеяння ў сферы энергетыкі, прыроднага газу, асабліва ўлічваючы ролю Егіпта ў якасці рэгіянальнага цэнтра ў сферы энергетыкі і стратэгічна выгаднае геаграфічнае становішча Рэспублікі Беларусь як краіны — транзітёра нафты ў Еўропу», — падкрэсліў кіраўнік Арабскай Рэспублікі Егіпет.

Падчас афіцыйнага візіту прэзідэнты Беларусі і Егіпта падпісалі сумесную заяву. Мемарандумам аб узаемадапамозе паміж беларускім МАРТ і Міністэрствам гандлю і прамысловасці Егіпта створаны савет дзелавога супрацоўніцтва. Падпісаны Мемарандум паміж Дзяржаўным камітэтам па стандартызацыі Беларусі і Егіпецкай арганізацыяй па стандартызацыі і якасці па супрацоўніцтве ў галіне стандартызацыі і інфармацыйнай падтрымцы. Такім жа дакументам зацвердзілі супрацоўніцтва ў сферы маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Беларусі і Міністэрства моладзі і спорту Егіпта. Акрамя таго, падпісана «Дарожная карта» развіцця супрацоўніцтва паміж краінамі на 2019—2020 гады.

Пасля завяршэння перагавораў за асабісты ўклад у развіццё двухбаковых адносін Аляксандр Лукашэнка ўзнагародзіў Абдэль Фатаха ас-Сісі ордэнам Дружбы народаў.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.
Марыя ДАДАЛКА.

Супрацоўніцтва

Вароты ў Афрыку

Егіпет гатовы пастаўляць сумесна выраблену прадукцыю на агульным рынку з 1600 мільёнамі насельніцтва

Такую думку выказаў прэзідэнт Егіпта Абдэль Фатах ас-Сісі на сустрэчы са старшыней Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімірам Андрэйчанкам і старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаілам Мясніковічам.

Кіраўнік ніжняй палаты нагадаў, што ў парламенце створаныя групы сяброўства. Ён падкрэсліў, што беларускія парламентарыі зацікаўленыя ў развіцці даверу паміж краінамі.

Міхаіл Мясніковіч выказаў упэўненасць, што можна і неабходна пашыраць супрацоўніцтва ў навуковай і адукацыйнай сферах, асабліва ў галіне інфармацыйных тэхналогій і кібербяспекі. Спікер верхняй палаты спадзяецца на павелічэнне колькасці сумесных праектаў.

На думку прэзідэнта арабскай рэспублікі, Егіпет мог бы стаць для Беларусі «варотамі» на рынак афрыканскіх і арабскіх краін, якія налічваюць 1600 мільёнаў жыхароў. Сёння Егіпет — асноўны гандлёвы партнёр Беларусі ў гэтым рэгіёне і мае магчымасць свабоднай рэалізацыі сумесна выраблены тавараў.

Акрамя таго, Абдэль Фатах ас-Сісі падкрэсліў, што Егіпет зацікаўлены не толькі ў гандлёвых і эканамічных сувязях з Беларуссю, але ў паглыбленні адносін у культурнай сферы.

Варвара МАРОЗАВА.

Напрамак на паўднёвы ўсход

Тавараабарот Беларусі і Узбекістана можа дасягнуць мільярда долараў у наступныя тры гады

Урад Беларусі зацікаўлены ў прамысловай кааперацыі з Узбекістанам і прапануе рэалізаваць маштабныя праекты па вытворчасці тэхнікі, паведаміў **намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір Дворнік** на пасяджэнні міжурадавай камісіі па двухбаковым супрацоўніцтве.

«Мінскі аўтамабільны завод гатовы ўдзельнічаць у стварэнні вытворчасцяў грузавой, спецыяльнай і прычапной тэхнікі, аўтобусаў на газаматорным паліве», — паведаміў віцэ-прэм'ер.

Ён падкрэсліў, што ва Узбекістане плануецца будаўніцтва завода па перапрацоўцы малака і малочнатаварнага комплексу на тысячу галоў. На думку Уладзіміра Дворніка, прарыўнымі могуць стаць праекты па аўтаматызацыі газатранспартнай і газаразмеркавальнай сетак Узбекістану з удзелам беларускіх прадпрыемстваў.

Беларускі бок таксама прапануе больш актыўна ўзаемадзейнічаць у галіне інфармацыйных тэхналогій, перш за ўсё наладзіць сувязі паміж паркамі высокіх тэхналогій і адукацыі. Па словах беларускага віцэ-прэм'ера, краіна зацікаўлена ў якаснай узбекскай прадукцыі: садавіне і агародніне, арэхах, баваўняным валакне, медным дроце.

Па ацэнцы намесніка **прэм'ер-міністра Узбекістана Эльера Ганіева,** узаемны тавараабарот можа дасягнуць мільярда долараў, як гэта даручана кіраўнікамі дзвюх краін, у наступныя тры гады.

Паводле БелТА.

«ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении открытого аукциона
по продаже объекта недвижимости ОАО «Белинпорторг»

ОАО «Белинпорторг» объявляет открытый аукцион по продаже

Лот № 1: капитальное строение с инвентарным номером 100/С-7139, площадью 3781,6 кв. м (назначение: здание административно-хозяйственное, наименование: административно-бытовой корпус), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 140100000001031340, площадью 0,5901 га. Земельный участок принадлежит ОАО «Белинпорторг» на праве постоянного пользования. Составные части и принадлежности капитального строения: асфальтовое покрытие (литер б), ливневая канализация (литер в), внутриплощадочная канализация (литер г), внешние сети водопровода (литер д), наружные теплосети (литер е), наружное освещение (литер ж), низковольтные сети (литер и) по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Инженерная, 19В.

Справочно: 1632,9 кв. м площадей капитального строения находится в аренде.

Начальная цена продажи с НДС (20 %) составляет 1 740 000,00 (один миллион семьсот сорок тысяч) белорусских рублей. Сумма задатка составляет 174 000,00 (сто семьдесят четыре тысячи) белорусских рублей.

Лот № 2: изолированное помещение с инвентарным номером 100/D-21411, площадью 1045,4 кв. м (назначение: помещение, не относящееся к жилищному фонду, наименование: помещение блока № 1 и № 2) (гараж), находящегося в капитальном строении с инвентарным номером 100/С-7150, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 141000000001019655, площадью 0,2627га по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Инженерная, 19. Земельный участок принадлежит ОАО «Белинпорторг» на праве общего долевого постоянного пользования.

Начальная цена продажи с НДС (20 %) составляет 355 200,00 (триста пятьдесят пять тысяч двести) белорусских рублей. Сумма задатка составляет 35 520,00 (тридцать пять тысяч пятьсот двадцать) белорусских рублей.

Задаток перечисляется на расчетный счет BY76 PJCB 3012 5021 8210 0000 0933 в ОАО «Приорбанк» ЦБУ 500 г. Брест, (б-р Шевченко, 6/1, г. Брест), БИК PJCBBY2X, УНП 200020512, в срок, установленный для приема заявления и необходимых документов на участие в аукционе.

Открытый аукцион состоится 19 июля 2019 года в 11.00 по адресу: Республика Беларусь, 224024, г. Брест, ул. Инженерная, 19, 3-й этаж, актовый зал.

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан заключить договор купли-продажи не позднее 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата производится Покупателем в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи. Обязательным условием в договоре купли-продажи является обязанность Покупателя возместить расходы Продавца по проведению рыночной оценки предмета аукциона, а также на публикацию в средствах массовой информации.

Торги проводятся в соответствии с законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже основных средств, принадлежащих ОАО «Белинпорторг», утвержденным организатором торгов.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 (три) календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по адресу: 224024, г. Брест, ул. Инженерная, 19, в рабочие дни по **16 июля 2019 года** включительно с 09.00 до 16.00.

Организатор аукциона – ОАО «Белинпорторг». Контактные телефоны: (8-0162) 45-56-44, 45-54-52, 45-52-45, тел./факс 45-53-38, e-mail: entbit@brest.by, www.belimporttorg.by.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 430/С-57182 (назначение – здание специализированное для общественного питания, наименование – здание кафе «Неман»), общей площадью 566,4 кв. м, расположенное по адресу: Новогрудский р-н, г. п. Любча, ул. Советская, 6

Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым № 424355700001000539, площадью 0,1997 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания кафе «Неман»), расположенном по адресу: Новогрудский р-н, г. п. Любча, ул. Советская, 6

Начальная цена продажи – 17 141,06 руб. (семнадцать тысяч сто сорок один рубль шесть копеек) с учетом НДС

Сумма задатка – 1 714 руб. (одна тысяча семьсот четырнадцать рублей)

ЛОТ 2: капитальное строение, инв. № 430/С-57062 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание конторы), общей площадью 769,5 кв. м, расположенное по адресу: Новогрудский р-н, г. п. Любча, ул. Советская, 25

Лот № 2 расположен на земельном участке с кадастровым № 424385990401000744, площадью 0,2684 га (назначение – земельный участок для обслуживания зданий и сооружений административного назначения), расположенном по адресу: Новогрудский р-н, г. п. Любча, ул. Советская, 25. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в охранных зонах электрических сетей, код – 5.2, площадью 0,0085 га; земли, находящиеся на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохраной зоне реки, водоема), код 2.4, площадью 0,2684 га

Начальная цена продажи – 14 386,78 руб. (четырнадцать тысяч триста восемьдесят шесть рублей семьдесят восемь копеек) с учетом НДС

Сумма задатка – 1 438 руб. (одна тысяча четыреста тридцать восемь рублей)

Условия проведения аукциона – аукцион без условий

Продавец – Новогрудский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231400, г. Новогрудок, ул. Гродненская, 103, тел. 8 01597 239-52

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 19 июля 2019 г. в 11.00 по адресу:
Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержится на сайте организатора аукциона http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:
г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30
(понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).
Последний день приема заявлений – 15 июля 2019 г. до 15.00

Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by

---

ООО «Фрондера» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Управляющая компания холдинга «Забудова»

Лот	Наименование	Местонахождение	Начальная цена без НДС, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона. без НДС, бел. руб
1	1. Капитальное строение с инв. № 630/С-75549, площадь – 4 442,7 кв. м, наименование – склад круглого леса, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; 2. Капитальное строение с инв. № 630/С-75548, площадь – 17,7 кв. м, наименование – щитовая, назначение – сооружение специализированное энергетики; 3. Сооружение с инв. номер по бух. учету 18000007 (вагон домик); 4. Сооружение с инв. номер по бух. учету 18000008 (вагон домик); 5. Сооружение с инв. номер по бух. учету 18000009 (вагончик деревянный); 6. Сооружение с инв. номер по бух. учету 18000010 (вагончик деревянный); 7. Сооружение с инв. номер по бух. учету18000011 (вагончик деревянный); 8. Сооружение с инв. номер по бух. учету 96001984 (беседка для курения); 9. Сооружение с инв. номер по бух. учету 18000029 (эстакада); 10. Кран козловой КК-0-12,5 с инв. № 71000542; 11. Контгруз (2 куб. м бетона) с инв. № 18000023	Минская обл., Молодечненский р-н, Чистинский с/с, п. Чисть Минская обл., Молодечненский р-н, Чистинский с/с, 1/19 вблизи п. Чисть Минская обл., Молодечненский р-н, Чистинский с/с, вблизи п. Чисть	147 766,80	7 388,34	7 388,34
2	Изолированное помещение с инв. № 630/D-38127. Наименование: квартира. Назначение: квартира. Общая площадь: 37 кв. м	Минская область, Молодечненский с/с, п. Чисть, ул. Максима Богдановича, д. 9Б-11	28 320,00	2 832,00	1 416,00
3	Изолированное помещение с инв. № 630/D-5142. Наименование: квартира. Назначение: квартира. Общая площадь: 53,3 кв. м	Минская область, Молодечненский с/с, п. Чисть, ул. 1-й Микрорайон, д. 6-11	40 640,00	4 064,00	2 032,00
4	Изолированное помещение с инв. № 630/D-5006. Наименование: квартира. Назначение: квартира. Общая площадь: 38,7 кв. м	Минская область, Молодечненский с/с, п. Чисть, ул. Русанова, д. 53-15	28 240,00	2 824,00	1 412,00
5	Изолированное помещение с инв. № 630/D-31819. Наименование: квартира. Назначение: квартира. Общая площадь: 53,1 кв. м	Минская область, Молодечненский с/с, п. Чисть, ул. 1-й Микрорайон, д. 4-9	35 600,00	3 560,00	1 780,00

В отношении лота № 1 проводятся первые повторные торги. В отношении лотов №№ 2–5 проводятся вторые повторные торги. Окончание приема заявлений – в 18.00 09.07.2019

Все вышеуказанные лоты расположены на земельном участке площадью 50,9873 га с кадастровым номером 623886007601000757, который является неделимым. Целевое назначение – земельный участок для содержания и обслуживания зданий и сооружений. Право постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь. Земельный участок находится в охранной зоне: электрических сетей, код – 5,2, площадь – 2,9281 га; газораспределительной системы, код – 5,7, площадь – 4,8900 га

УСЛОВИЯ

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано единственным участником, либо единственный участник, явился для участия в аукционе, и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, затрат на публикацию в течение 14 (четырнадцати) дней со дня проведения аукциона.

Оплата приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) производится в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона и затрат по размещению публикации в газете и на сайте bankrot.gov.by на основании счета-фактуры в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

Аукцион состоится 11.07.2019 в 12.00 (регистрация участников – с 11.30 до 12.00) по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, п. Чисть, ул. Заводская, 1 (приемная)

Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте https://sites.google.com/site/pcjuristcom/torgi.

До подачи заявления необходимо внести задаток на **р/с BY36ALFA30122215570040270000** в Отделении «На Красной» ЗАО «Альфа-Банк», код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера». Назначение платежа: «задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Управляющая компания холдинга «Забудова» (Лот №__), проводимом 11.07.2019 г.».

Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1122.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона. Контактное лицо для осмотра Объектов: Мацюк Андрей Богданович, тел. 8 (029) 698 51 76.

По вопросам наличия обременений на вышеуказанные лоты обращаться по телефону 8 (029) 171-09-46 (Кибзюк Дмитрий Николаевич).

Организатор аукциона вправе после опубликования извещения о проведении аукциона отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»

Организатор аукциона – ООО «Фрондера»: • 8 (029) 305 86 50 • e-mail: frondera@mail.ru

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ
ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
на право заключения договора аренды земельного участка

Организатор аукциона: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 24-63-14

Предмет аукциона, кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, срок аренды, размер начальной цены и задатка

Лот № 1. Право заключения договора аренды сроком на 25 лет земельного участка с кадастровым № 240100000003010489, расположенного по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пересечение улицы Богатырева и улицы Актеров Еременко, площадью 0,3500 га, для строительства объекта «Объект общественного питания, расположенный на пересечении улицы Богатырева улицы Актеров Еременко в г. Витебске» (целевое назначение – размещение объектов общественного питания). Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: участок расположен в охранных зонах электрических сетей напряжением до 1000 В на мелиорируемых (мелиорированных) землях. **Нач. цена:** 72681,46 бел. руб. **Задаток:** 7268,15 бел. руб.

Лот № 2. Право заключения договора аренды сроком на 25 лет земельного участка с кадастровым № 240100000001014474, расположенного по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Янопольская, площадью 0,5675 га, для строительства объекта «Логистический центр в районе улицы Янопольской в г. Витебске» (целевое назначение – размещение объектов иного назначения). Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: участок расположен в зоне санитарной охраны водного объекта, используемого для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зоне санитарной охраны в местах водозабора. **Нач. цена:** 51892,88 бел. руб. **Задаток**: 5189,29 бел. руб.

Дата, время и место проведения повторного аукциона: 11.07.2019 в 15.00, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатка и подачи документов: с 19.06.2019 с 8.30 по 10.07.2019 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY14AKBB36423020002802000000, ф-л № 200 ВОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21200, УНП 300200386, получатель платежа: Витебский горисполком. Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» 23.04.2019

Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона, обязан:** внести плату за право заключения договора аренды предоставляемого земельного участка в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона; возместить в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участниками документации, необходимой для его проведения; возместить в установленном порядке убытки Витебскому горисполкому, причиняемые нарушением функционирования мелиоративных сооружений, в сумме: 1666 белорусских рублей (по лоту № 1), 1770 белорусских рублей (по лоту № 2); заключить с Витебским горисполкомом договор аренды зем. участка; в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды, но не позднее трех месяцев со дня утверждения протокола о результатах аукциона, в установленном порядке обратиться за гос. регистрацией права на зем. участок в РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; обратиться в установленном порядке за получением разрешительной документации на строительство объекта в срок, не превышающий 3 месяца с момента гос. регистрации права на зем. участок; при необходимости привлечь инженерную организацию (инженера) для оказания инженерных услуг в строительстве в порядке и на условиях, предусмотренных законодательством и договором на оказание инженерных услуг; выполнить работы по подготовке проектной документации при условии заключения в установленном порядке договора подряда на проведение проектных и изыскательских работ в срок до одного года со дня гос. регистрации права на зем. участок; разработать проектно-сметную документацию в соответствии с действующими техническими нормативными правовыми актами; согласовать проектно-сметную документацию с главным архитектором г. Витебска; при необходимости провести гос.экспертизу проектно-сметной документации. Для участия в аукционе приглашаются граждане, индивидуальные предприниматели, юр. лица, консолидированные участники (двое и более граждан, индивидуальных предпринимателей, юр. лиц). Для участия в аукционе граждане, индивидуальные предприниматели, консолидированные участники и юр. лица (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный срок подают заявление на участие в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет с отметкой банка, заключают соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр. лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; представителем иностранного юр. лица – легализованные копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык, легализованные доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о фин. состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного гражданина – легализованная доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; консолидированными участниками представляются оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов предъявляется документ, удостоверяющий личность. Аукцион состоится при наличии не менее двух участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Конт. тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.

Извещение о повторном открытом аукционе по продаже имущества ОАО «Чайка» (г. Гродно, пер. Дзержинского, д. 21, ул. Врублевского, д. 84) 23 июля 2019 года

Вид аукциона открытый	Лот № 1*	Лот № 2	Лот № 3
Предмет аукциона	Капитальное строение с инвентарным номером 400/С-86693 здание административно-хозяйственное (административное здание) общей площадью 384,8 кв. м. Год постройки – 1966	Изолированное помещение с инвентарным номером 400/D-92426 неустановленного назначения (пункт проката) общей площадью 155,4 кв. м. Год постройки – 1979	Капитальное строение с инвентарным номером 400/С-21120, сооружение специализированное складов, хранилищ (центральный склад) общей площадью 144,0 кв. м. Год постройки – 1990
Начальная цена продажи	**141 000,00 рублей** (с учетом НДС 20 %)	**68 640,00 рублей** (с учетом НДС 20 %)	**54 360,00 рублей** (с учетом НДС 20 %)
Кадастровые номера земельных участков и размеры	440100000002005393, 0,0366 га	440100000002003695, 0,1031 га (3/100 доли)	440100000002003528, 0,0122 га
Месторасположение земельных участков	г. Гродно, пер. Дзержинского, д. 21	г. Гродно, ул. Врублевского, д. 84	г. Гродно, ул. Врублевского, д. 84
Имущественное право земельных участков	Право постоянного пользования	Право постоянного пользования	Право постоянного пользования
Продавец	Открытое акционерное общество по химической чистке одежды и стирке белья «Чайка», г. Гродно, ул. Зернова, 6, тел.: 8 (0152) 607302, 745502		
Сумма задатка	7 050,00 рубля	2 059,20 рубля	1 630,80 рубля
Организатор аукциона	Коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, тел.: 720537, 720010		
Дата проведения аукциона	**23 июля 2019 года**		
Время проведения аукциона	12.00		
Место проведения аукциона	**г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал**		
Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов	г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 407		
Дата и время начала приема документов	**20 июня 2019 года, 8.00**		
Дата и время окончания приема документов	17 июля 2019 года, 17.00		

* – объект обременен договор

І мы там былі

ЧЫТАЦКІ РАЙ У МІРСКІМ ЗАМКУ

Статут ВКЛ, самаробнікі, экслібрысы і іншыя выдавецкія скарбы

• оцениваем надлежащий характер применяемой аудируемым лицом учетной политики, а также обоснованности учетных оценок и соответствующего раскрытия информации в финансовой отчетности;
• оцениваем правильность применения руководством аудируемого лица допущения о непрерывности деятельности, и на основании полученных аудиторских доказательств делаем вывод о том, имеется ли существенная неопределенность в связи с событиями или условиями, в результате которых могут возникнуть значительные сомнения в способности аудируемого лица продолжать свою деятельность непрерывно. Если мы приходим к выводу о наличии такой существенной неопределенности, мы должны привлечь внимание в аудиторском заключении к соответствующему раскрытию данной информации в финансовой отчетности. В случае если такое раскрытие информации отсутствует или является ненадлежащим, нам следует модифицировать аудиторское мнение. Наши выводы основываются на аудиторских доказательствах, полученных до даты подписания аудиторского заключения, однако будущие события или условия могут привести к тому, что аудируемое лицо утратит способность продолжать свою деятельность непрерывно;
• оцениваем общее представление финансовой отчетности, ее структуру и содержание, включая раскрытие информации, а также оцениваем, обеспечивает ли финансовая отчетность достоверное представление о лежащих в ее основе операциях и событиях.
Мы осуществляем информационное взаимодействие с лицами, наделенными руководящими полномочиями, доводя до их сведения, помимо прочего, информацию о запланированных объеме и сроках аудита, а также о значимых вопросах, возникших в ходе аудита, в том числе о значительных недостатках системы внутреннего контроля.
Мы предоставляем лицам, наделенным руководящими полномочиями, заявление о том, что нами были выполнены все этические требования в отношении соблюдения принципа независимости и до сведения этих лиц была доведена информация обо всех взаимоотношениях и прочих вопросах, которые можно обоснованно считать угрозами нарушения принципа независимости, и, если необходимо, обо всех предпринятых мерах предосторожности.
Из числа вопросов, доведенных до сведения лиц, наделенных руководящими полномочиями, мы выбираем ключевые вопросы аудита и раскрываем эти вопросы в аудиторском заключении (кроме тех случаев, когда раскрытие информации об этих вопросах запрещено законодательством или когда мы обоснованно приходим к выводу о том, что отрицательные последствия сообщения такой информации превысят пользу от ее раскрытия).

Заместитель директора по аудиту финансовых институтов — Н. В. Кондратьева

Аудитор, возглавлявший аудит — М. В. Рассолько

Дата заключения: 10 мая 2019 года
Место выдачи аудиторского заключения: г. Минск, Республика Беларусь
Дата получения аудиторского заключения аудируемым лицом: 10 мая 2019 года

Сведения об аудиторе:
Наименование: Общество с ограниченной ответственностью «БДО»
Место нахождения: Республика Беларусь, 220020, г. Минск, пр-т Победителей, 103, 8-й этаж, помещение 7
Сведения о государственной регистрации: Свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом от 15 ноября 2013 года
УНП: 190241132

Извещение о проведении повторного аукциона по продаже земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных, блокированных жилых домов

Организатор аукциона – Крошинский сельский исполнительный комитет Барановичского района

Местоположение земельного участка, адрес, кадастровый номер участка	Характеристика инженерных коммуникаций	Площадь земельного участка (га)	Назначение участка	Начальная цена объекта (руб.)	Сумма задатка (руб.)	Расходы по формированию и регистрации земельного участка и проведению аукциона (руб.)
Республика Беларусь, Брестская обл., Барановичский район, Крошинский с/с, д. Дубово, ул. Лесная, 19, кадастровый номер 120483002001000264	Участок свободен от застройки, возможность подключения электричества, канализация – местная	0,1238	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	1857,00	185,70	1893,92, кроме того, плюс расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ и другие расходы по проведению аукциона
Республика Беларусь, Брестская обл., Барановичский район, Крошинский с/с, д. Дубово, ул. Лесная, 21, кадастровый номер 120483002001000265	Участок свободен от застройки, возможность подключения электричества, канализация – местная	0,1246	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	1869,00	186,90	1749,12, кроме того, плюс расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ и другие расходы по проведению аукциона

Аукцион состоится 4 июля 2019 года в 15.00 по адресу: Республика Беларусь, Брестская область, г. Барановичи, ул. Советская, д. 79, каб. 302.
Сумма задатка перечисляется на расчетный счет BY23AKBB36412110800301300000 филиал 802 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21802, УНП 200046981 (адрес банка: г. Барановичи, бульвар Штоккерау, 8а).
Получатель: Крошинский сельский исполнительный комитет, 225362 Брестская обл., Барановичский р-н, аг. Крошин, ул. Ленина, 8.
Порядок проведения аукциона оговорен в Положении о его проведении.
Заявления на участие в аукционе принимаются после размещения извещения о проведении аукциона в СМИ в рабочие дни с 19 июня 2019 года с 8.

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 287-18-36.

«ЛЯЧЭННЕ ІДЗЕ ПРАЗ ДАБРО»

Спадчынны кітайскі лекар шмат гадоў дапамагае беларусам зразумець, што зайздрасць і прагнасць разбураюць наша здароўе

Іголкатэрапія як метад лячэння ўжываецца ў еўрапейскай медыцыне ўсяго каля стагоддзя. Затое ў кітайскай і карэйскай медыцыне гэтыя методыкі выкарыстоўваюцца ўжо больш за дзве тысячы гадоў. За гэты час мноства ўрачоў і пацыентаў пераканаліся ў іх эфектыўнасці. Іголкатэрапія дапамагае пры хваробах сасудзістай і нервовай сістэм, страўнікава-кішэчных паталогіях, парушэннях дыхання, захворваннях апорна-рухальнага апарату, пры рэабілітацыі пасля траўм і іншым. Пра асаблівасці такога лячэння мы распыталі спадчыннага лекара з Кітая.

Урач традыцыйнай кітайскай медыцыны Інсар БЭЙ без малога 25 гадоў працуе ў Беларусі. У дзяцінстве ён разам з сям'ёй, якая пакінула Кітай, трапіў у Савецкі Саюз. Скончыў Другі маскоўскі медыцынскі ўніверсітэт (цяпер Расійскі нацыянальны даследчы медыцынскі ўніверсітэт імя М. І. Пірагова.), вучыўся ў Кітаі, у Акадэміі ўсходняй медыцыны, потым у Індыі спасцігаў уласцівасці лячэбных траў і фітатэрапію. За час сваёй працоўнай дзейнасці ён дапамог больш чым 570 тысячам хворых. А яго паслугам дадатковая рэклама не патрэбна — пацыенты самі расказваюць пра лекара сябрам і знаёмым. Сёння ён працуе ў адным з медыцынскіх цэнтраў Мінска.

— Самае вялікае багацце чалавека — гэта яго імя, — упэўнены Інсар Бэй. — Калі лечыш людзей, нельга думаць, колькі за гэта заплацяць, не варта нават глядзець у той бок. Найперш трэба клапаціцца пра здароўе чалавека. І калі пацыента пазбавілі ад хваробы, ён аддзячыць, як зможа.

— Інсар, у каго вы пераймалі майстэрства?

— Лекаванне — гэта не спецыяльнасць, а рамяство, якое ў мяне на радзіме перадаецца з пакалення ў пакаленне. Я вучыўся ў свайго дзядзькі, пачынаў, калі мне не было і шасці гадоў. Паколькі наша сям'я апынулася ў Савецкім Саюзе, я скончыў Маскоўскі медінстытут, пасля вучыўся ў Кітаі і Індыі. Я вучыўся ўсё жыццё, і прыйшоў да высновы, што чым больш чалавек ведае, тым больш бездапаможным становіцца. Часам прыходзяць пацыенты з такімі дыягназамі, пра якія ты ніколі не чуў. Як растлумачыць, што ў арганізме чалавека правая частка засвойвае кальцый, а левая — не? Адзін бок «хрустальны», другі — не. Калі сутыкаешся з такімі рэчамі, пачынаеш задыхацца ад няведання. Калі мне трапіўся такі хлопчык, я перапытаў усіх сваіх знаёмых і блізкіх, хто займаецца лекаваннем, — ніхто не ведаў, чаму так адбываецца. Пасля высветлілася, што такіх людзей усяго чатыры ў свеце, гэту інфармацыю агучылі на адным з Міжнародных сімпозіумаў артапедаў.

— З якімі захворваннямі паказана іголкарэфлексатэрапія?

— Тут няма абмежаванняў. Адзінае — важна правільна скарыстаць гэтыя методыкі. Здараецца, што па іх працуюць недасведчаныя людзі. Няма пэўнага алгарытму, скажам, пры галаўным болі. Гэта не таблетка, якую выпілі і боль прайшоў. Тут спачатку трэба знайсці, у чым прычына захворвання. У Кітаі прымяняецца еўрапейская медыцына, але ў асноўным у траўматалогіі, хірургіі. А вось еўрапейскую тэрапію вельмі мала ўжываюць, толькі ў асобных выпадках. Забалела галава — вы прынялі таблетку і пайшлі на лячэнне. І лекар глядзіць, як справіцца з гэтай праблемай. Або калі падняўся ціск, таблеткай яго зніжаюць, і адразу ж — на лячэнне іголкамі.

Каб знайсці прычыну болю, скажам, у сэрцы, трэба ведаць стан бронхаў, лёгкіх, мачавога пузыра, нырак, наднырачнікаў, страўніка, печані, падстраўнікавай залозы, шчытападобнай залозы, селязёнкі, пазваночніка (наяўнасць астэахандрозу). Нейкі з гэтых органаў дае нагрузку на сэрца і выклікае боль.

— Якім чынам вы вызначаеце прычыну болю?

— Праз пульсавую дыягностыку. Ёсць шэсць пунктаў пульсу — па тры на кожнай руцэ. Па характарыстыцы пульсу вызначаецца захворванне. Пульс можа быць пусты ці поўны, колкі, хвалепадобны — шмат разнавіднасцяў. Пацыент прыходзіць да мяне нашча, і я вызначаю, які орган працуе няправільна.

Калі мы лечымся, мы найперш павінны ўздзейнічаць на прычыну, а не на наступствы. Калі нам даюць таблетку, праз нейкі час яна ўжо не дапамагае, мы бяром большую дозу ці пераходзім на іншы прэпарат. А хвароба працягвае сядзець у чалавеку. Гэта падаўленне захворвання, а не лячэнне. Калі мы прыбіраем прычыну, хвароба сама сыходзіць. Арганізм чалавека надзвычай складаны механізм. Ніколі нельга казаць, што гэта — канец. Калі яму дапамагчы, можна перамагчы любую немач. Раздражняючы пункт ці некалькі, мы «паказваем» арганізму на праблему, і далей ён сам з ёй спраўляецца. Вось у нашага пацыента была падагра, ён ледзь хадзіў. Гэта значыць, мачавіна з арганізма выходзіць, а мачавая кіслата застаецца, выклікаючы запаленчы працэс. Значыць, трэба лячыць ныркі. Я пралячыў яму ныркі, і падагра знікла.

— А можна вярнуць чалавеку добры настрой? Умоўна кажучы, ці ёсць кропка на целе, на якую можна націснуць, каб чалавек стаў шчаслівы?

— У мяне была адна жанчына, якая кожныя паўгода прыводзіла сваю свякроў. Я спытаў, навошта яна яе мучыць *(усміхаецца)*. Жанчына сказала, што пасля маіх сеансаў яе сваячка знаходзіцца ў выдатным спакойным настроі некалькі месяцаў... Калі чалавек пакутуе, хварэе, ён робіцца злы, нервовы. Трэба высветліць, што ў жыцці ідзе не так. Чалавек жа нараджаецца добрым: паназірайце, якія дзеці шчаслівыя, як яны гуляюць паміж сабой. А жыццё ставіць нас у такія сітуацыі, калі мы робімся іншымі. Але любога чалавека можна зразумець, і знайсці той пункт, на якім ён спатыкнуўся. Адсунуць яго, і чалавек зноў пойдзе прама і стане такім, як быў.

— На ваш погляд, чарнобыльская катастрофа моцна паўплывала на здароўе беларусаў?

— Няправільна звязваць колькасць анкалагічных хвароб з Чарнобылем. Хіба што павялічылася колькасць дзяцей, якія пакутвалі на анкалагічныя хваробы. Я вывучаў рэгіянальныя хваробы ад Піцера і да Камчаткі. Глядзеў, у якіх рэгіёнах на якія захворванні людзі часта хварэюць. Ад Балтыкі да Ціхага акіяна людзі хварэюць на анкалагічныя хваробы практычна аднолькава. Магу з упэўненасцю сказаць, што і на Камчатцы, і ў Піцеры, і ў Беларусі — усюды карціна падобная.

— Якія нашы якасці і звычкі перашкаджаюць нам заставацца здаровымі?

— Наша цела фізічна пакутуе ад нашага мыслення, ладу жыцця, працы. Самае асноўнае — сям'я, наш быт. Калі ў сям'і добрыя гарманічныя адносіны, дзеці вырастаюць вельмі здаровыя і амаль не хварэюць.

Хварэюць у асноўным людзі, прагныя да грошай. У грамадстве сёння многае мераюць манетай, гэта няправільна. Маладым людзям не тлумачаць, што не ўсё ў гэтым свеце можна набыць і прадаць. Чалавечыя адносіны не прадаюцца і не набываюцца. Не ўсе заходнія каштоўнасці для нас прыдатныя, не трэба ўсё слепа пераймаць.

Наша крыўда нас прыводзіць да анкалагічных хвароб. Таксама і зайздрасць, якая пачынае чалавека раз'ядаць, як іржа. Без злосці, зайздрасці, крыўды можна жыць. Калі чалавек імпульсіўны, трэба выплюхнуць свае эмоцыі — і забыць. Калі нехта вас пакрыўдзіў, не трымайце гэта ў сабе.

— Вы адразу бачыце, што за чалавек перад вамі? Як наладжваеце кантакт?

— Я кожнага чалавека энергетычна абдымаю і трымаю ў сваіх абдымках. Калі пацыент прыходзіць да мяне, ён не адчувае сябе няёмка. Калі чалавек адкрываецца, яго нашмат прасцей лячыць.

— Вы яшчэ і шмат дапамагаеце людзям — часам бясплатна...

— Ёсць незабяспечаныя людзі, яны прыязджаюць з вёсак, шмат грошай патрацілі на розныя прэпараты. Мы ведаем, у якіх умовах яны жывуць. Калі я бачу, што чалавек небагаты, раблю яму скідку. Ёсць людзі, з якіх увогуле не бяром аплату. Але мы самі вырашаем, каму дапамагчы. Быў выпадак, калі прыйшоў веруючы чалавек: «Я шмат чуў, што вы дапамагаеце людзям. Я таксама хацеў бы дапамагчы — заплаціць за траіх». Я кажу: добра, заплаціце ў касу, а за тое, што вы робіце добрую справу, я яшчэ траіх пралячу ад вашага імя. Так бясплатна я пралячыў шасцярых. Калі пыталі, каму дзякаваць, адказваў: ідзіце ў храм і ўспамінайце Аляксандра. Рабіць дабро неабходна, менавіта праз яго праходзіць лячэнне.

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Нашы дзеці

У кожнага трэцяга — праблемы са зрокам

Афтальмолагі праверылі 5,5 тысячы сельскіх школьнікаў Віцебшчыны

Завяршыўся першы этап маштабнага дабрачыннага праекта «Я бачу!» у Віцебскай вобласці. З сакавіка да канца мая гэтага года брыгады афтальмолагаў правялі дыягностыку зроку і аказалі дапамогу амаль 5,5 тысячы дзяцей, якія вучацца ў сельскіх школах васьмі раёнаў рэгіёна. Праект арганізаваны Беларускім дзіцячым фондам і кампаніяй velcom і A1 пры падтрымцы Віцебскага аблвыканкама і Міністэрства аховы здароўя.

На першым этапе брыгады афтальмолагаў наведалі сельскія школы Бешанковіцкага, Верхнядзвінскага, Глыбоцкага, Докшыцкага, Дубровенскага, Сенненскага, Аршанскага і Расонскага раёнаў. Дыягностыку органаў зроку прайшлі 5462 дзіцяці. У 31 працэнта з іх выяўлены розныя паталогіі, з іх больш чым у 40 працэнтаў праблемы знойдзены ўпершыню.

Праект «Я бачу!» закліканы зрабіць афтальмалагічную дапамогу больш даступнай для дзяцей, якія жывуць у сельскай мясцовасці. Для работы выязных брыгад урачоў аснашчаны два аўтамабілі з неабходным партатыўным абсталяваннем. У залежнасці ад вынікаў аглядаў дзеці атрымліваюць заключэнне ўрача, рэцэпты на акуляры або накіраванне ў Віцебскі абласны дзіцячы клінічны цэнтр для паглыбленай дыягностыкі ці лячэння.

Пасля летніх канікул — з верасня па снежань — праект працягне сваю работу ў Талачынскім, Чашніцкім, Лёзненскім, Гарадоцкім, Віцебскім, Мёрскім, Ушацкім, Шаркаўшчынскім, Шумілінскім, Полацкім і Лепельскім раёнах. На Віцебшчыне брыгады афтальмолагаў наведаюць 19 раёнаў і праверацьзрок у 14 тысяч сельскіх школьнікаў.

ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ

Памяць

«Вялікі грэх забыць той боль...»

Шмат выпрабаванняў выпала на долю ветэранаў вайны, але ж яны адстаялі гонар і незалежнасць нашай Радзімы, вярнулі свабоду зняволеным народам Еўропы, узнялі над Берлінам сцяг Перамогі!
Удзельнікаў тых падзей — ветэранаў — з кожным годам робіцца ўсё менш і менш. У нашым Чыгуначным раёне Гомеля 13 інвалідаў вайны, 47 яе ўдзельнікаў, 51 працаўнік тылу, 6 блакаднікаў Ленінграда...

Раённая ветэранская арганізацыя праводзіць вялікую работу па іх сацыяльнай абароне, стараецца падтрымаць, запрашае на сустрэчы з моладдзю, на ўрокі мужнасці. Нарэшце 75-годдзя вызвалення Беларусі я хачу расказаць пра франтавіка, якога ведаюць не толькі ў нашым раёне і горадзе.

Алег Назаравіч Пліндаў нарадзіўся 14 сакавіка 1923 года ў гарадскім пасёлку Круглае ў сям'і служачага. Калі пачалася вайна, скончыў першы курс філалагічнага факультэта Магілёўскага педінстытута і быў уключаны ў склад партыйна-камсамольскага знішчальнага батальёна па барацьбе з нямецкімі дыверсантамі. Потым ваяваў памочнікам камандзіра ўзвода разведкі 91-й гвардзейскай дывізіі на Заходнім, Калінінскім і 3-м Беларускім франтах, двойчы быў паранены. Вясной 1944-га ў баях за чыгуначны паўстанак пад Віцебскам атрымаў трэцяе раненне, а ў выніку — інваліднасць. Дэмабілізаваўся Алег Назаравіч з ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступені, двума медалямі за адвагу...

Але ж у гады вайны здараліся і кур'ёзы. Вось толькі адзін: неяк камбат папрасіў у Алега процівагаз, а замест яго ў сумцы аказаліся... зборнікі вершаў Блока, Твардоўскага, Гётэ. «Камандзір як не абамлеў, — згадваў ветэран, — закрычаў: «Ты што — немца чытаеш?!» А я ў адказ: «Я з Гітлерам ваюю. Гэта — ганьба Германіі, а Гётэ — яе слава. Ён вялікі паэт!»

Алег Пліндаў ведаў, пра што казаў, бо захапляўся паэзіяй яшчэ да вайны...

Пасля вяртання на радзіму ён працаваў настаўнікам — вучыў іншых і адначасова давучваўся сам. Быў дырэктарам школы, загадчыкам РАНА: больш за 50 гадоў адпрацаваў у сістэме адукацыі, узнагароджаны медалём «За доблесную працу».

З 1946 года Алег Назаравіч супрацоўнічае з раённай газетай «Зара над Друццю», піша пра вайну. Дарэчы, падчас яе Алег Назаравіч вёў дзённікі, фрагменты якіх публікаваліся ў франтавых газетах. Свае запісы ён перадаў унучцы Таццяне...

А нядаўна ў франтавіка адбылася кранальная сустрэча ў нашым медуніверсітэце. Студэнты, якія прыехалі вучыцца з Індыі, Бангладэш, Туркменіі, наладзілі ў гонар ветэрана адмысловы канцэрт: кожны выбраў і ўголас прачытаў нейкі з вершаў Алега Назаравіча... Для ветэрана гэта было вельмі прыемна! Як і словы студэнткі Азізы Джумакулыевай, прадзед якой Джума Дурдыеў ваяваў пад Масквой, быў паранены і нядаўна адзначыў сваё 95-годдзе. Дзяўчына казала, што ад прадзядулі шмат чула пра вайну, што ўдзячная ўсім за перамогу, за тое, што нарадзілася і жыве ў мірны спакойны час. А на завяршэнне сустрэчы пакаленне маладых, якое не расстаецца з гаджэтамі, скарысталася імі і тут: студэнты рабілі сэлфі з героем і паэтам.

Алег Назаравіч Пліндаў — аўтар зборнікаў «Я мог бы погибнуть в 43-м...», «Рукопожатие», «Отставший от стаи» і «Какими мы были». У адным з іх ёсць такія радкі:

Великий грех забыть ту боль,
Весь строй солдатских обелисков,
Солдат, кто жертвовал собой
Под Брестом, Могилевом, Минском...

Т. І. Адамовіч, старшыня раённага Савета ветэранаў,
г. Гомель.

Свой погляд

ЯК ВУЧЫЦЦА ДЗЕЦЯМ — РАЗАМ ЦІ АСОБНА?

Настаўнікі (асабліва са стажам) часта «перасякаюцца» са сваімі былымі вучнямі, і мяне асабіста найбольш радуюць сустрэчы з тымі, хто ўжо вызначыў сваё месца ў жыцці, хто ўпэўнена ідзе па абраным шляху, гадуе дзяцей, думае пра іх лёс... «Мы з жонкай вырашылі адправіць свайго сына ў прыватную гімназію, — прызнаўся надоечы адзін з маіх вучняў. — Там цяпер і ўзровень выкладання вышэйшы, і адносіны да дзяцей лепшыя».
Мы абмеркавалі гэтую тэму, я прывёў свае довады і потым яшчэ доўга думаў: адкуль у людзей такія перакананні? Можа, з-за асобных педагогаў, якія ў дзяржаўных установах адукацыі несумленна выконваюць свае абавязкі? Ці ад чагосьці яшчэ?

Давайце ўспомнім школу часоў Савецкага Саюза. Тады дзеці аднаго ўзросту, як правіла, займаліся ў адным класе. Калі нехта з вучняў адставаў ад сваіх аднакласнікаў, атрымліваў дрэнныя адзнакі, не спраўляўся з праграмай, яго маглі пакінуць на другі, а то і на трэці год. За тры гады любы вучань, хай не вельмі добра, але вучэбны матэрыял засвойваў. Пасля васьмі-дзевяці класаў ён атрымліваў пасведчанне аб базавай адукацыі і мог вучыцца далей альбо пайсці працаваць.

Што адбываецца цяпер, пры 10-бальнай сістэме ацэнкі ведаў? Вучняў на другі год амаль не пакідаюць. Але ці правільна гэта, ці ўсе дзеці засвойваюць вучэбны матэрыял?

Да нядаўняга часу ў гімназіях нашай краіны вучні пасля чацвёртага класа павінны былі здаваць экзамены, каб перайсці ў сярэдняе звяно. Калі нехта «правальваўся», ішоў у пяты клас іншай школы. Такім чынам, у гімназіі заставаліся толькі моцныя вучні.

Цяпер такія экзамены адменены. Добра гэта ці дрэнна? Нядаўна давялося пачуць, як пра гэта спрачаліся жанчыны. Адны казалі, што цяпер нарэшце не будзе падзелу на «разумных» і «дурных» і ў гімназіі змогуць займацца ўсе ахвотныя дзеці, незалежна ад іх паспяховасці. Другія былі катэгарычна супраць: яны не хацелі, каб у адным класе з іх дзецьмі займаліся слабыя вучні, якія запавольваюць адукацыйны працэс.

Хто ж з іх мае рацыю?

Ну вядома ж, у кожным класе ёсць лепшыя вучні, якія па паспяховасці апярэджваюць сваіх аднагодкаў. На ўроку настаўніку даводзіцца даваць ім больш складаныя заданні, каб яны ішлі наперад і развіваліся, а самому больш займацца з іншымі, бо яны таксама павінны засвоіць неабходны матэрыял...

Я працую настаўнікам 4 класа. У ім дзевяць вучняў. Трое з іх займаюцца па праграме аддзялення дапаможнай школы, то-бок, калі казаць прасцей, — вучацца ў асобным інтэграваным класе і прысутнічаюць толькі на некаторых нашых уроках, такіх, напрыклад, як фізкультура і здароўе, маляванне, музыка і г. д. Я як класны кіраўнік не толькі на ўроках, але і ў пазаўрочны час на агульных мерапрыемствах стараюся аб'яднаць і згуртаваць сваіх вучняў, каб ніхто з іх не адчуваў сябе аддзеленым ад асноўнага класа, стараюся зрабіць усё магчымае, каб такі падзел не быў для дзіцяці балючы.

Цяпер вялікая ўвага аддаецца ўзроўню разумовых здольнасцяў. Ужо на пачатковай ступені спецыяльныя камісіі вызначаюць, можа дзіця навучацца ў асноўным класе ці яму больш падыдзе спецыяльная праграма. Пры пэўнай колькасці такіх вучняў фарміруюцца нават цэлыя класы, у якіх павінны працаваць настаўнікі-дэфектолагі.

Трэба сказаць, што апошняе слова тут застаецца за бацькамі. Толькі ім вырашаць, вучыцца іх дзіцяці ў такім вось класе ці не. Мы, педагогі, а таксама адміністрацыя школы стараемся пераканаць бацькоў у неабходнасці дадзенай формы навучання для іх дзяцей. Бо рэдкі настаўнік захоча, каб у яго класе займаўся слабы вучань, які не будзе ў вучобе паспяваць за сваімі аднагодкамі. Ды і для адміністрацыі школы фарміраванне такіх асобных класаў — гэта дадатковыя працоўныя месцы. Але ж у першую чаргу мы павінны працаваць для дзяцей і рабіць так, каб лепш было ім.

Такім вучням адразу пасля школы давядзецца ісці вучыцца далей, а некаторым пры жаданні ўладкоўвацца на працу. Праўда, не ўсе з іх змогуць працаваць там, дзе захочуць, бо не ў кожнай арганізацыі возьмуць на работу чалавека з такім вось «асаблівым» пасведчаннем аб заканчэнні школы. А таму, на мой погляд, нам у гэтым кірунку трэба многае пераглядзець.

Анатоль Аскірка,
г. Быхаў.

Я зноў выбіраю «Звязду»!

«...ЖЫВЕ ТАКІ НАРОД»

Наступны год у нашай сям'і будзе багаты на юбілеі: нам з мужам споўніцца па 70, нашай дачушцы — 45, старэйшаму ўнуку — 25, малодшанькай унучцы — 5...

І яшчэ адна прыгожая і важная для нас дата: 45 гадоў таму мы ўпершыню падпісаліся на «Звязду».

Гэта — вялікі адрэзак часу, а таму, вядома ж, не пералічыць усё добрае, што звязана з газетай. З ёй у наш дом прыходзілі навіны і самыя розныя парады, яна расказвала пра лёсы людзей, выхоўвала, адукоўвала, прасвятляла...

На пачатку дзевяностых, памятаю, усю дакументацыю па справаводстве мы вучыліся весці па-беларуску. Я тады працавала сакратаром сельскага выканкама. І як жа рада была, што выбрала менавіта «Звязду», як удзячна была ёй за родную мову! Хоць — павінна прызнацца — мой першы пратакол з сесіі сельсавета дачка Волечка, якая на той час вучылася ў Нясвіжскім педвучылішчы, аціаніла ўсяго на чацвёрку... І нават з мінусам.

Але ж плюсы пайшлі вельмі хутка: усе сцэнарыі па рэгістрацыі шлюбаў, нараджэння дзяцей, юбілеяў я праводзіла па-беларуску. Людзям гэта вельмі падабалася і, думаю, запаміналася на ўсё жыццё...

Нехта скажа, што тое было даўно? Але ж адносна нядаўна з пятнічнымі нумарамі «Звязды» да падпісчыкаў стала прыходзіць «Мясцовае самакіраванне» і цяпер яно, можна сказаць, мой найпершы сябар і дарадца, бо я — стараста вёскі.

...Карацей, пра любімую газету можна расказваць доўга і зычыць ёй многага. А можна — сказаць коратка:

Свяці ж у стагоддзях
І грэй нашы душы,
А мы на твой голас
Адклікнуцца мусім,
Каб золатам ззяла
Матуліна слова!
У свеце каб знялі:
Жыве наша мова!

А значыць, жыве нацыя, жыве такі народ — беларусы.

Ніна Іванаўна Суран,
в. Горная Рута, Карэліцкі раён.

Чалавек — чалавеку

Ныряць проста...

Нездарма ў народзе кажуць: «Тваё жыццё ў тваіх руках» і «Не ведаючы броду, не сунься ў воду!» Але ж гэта разумееш альбо з гадамі, альбо...

Я, напрыклад, рос на берагах рэк, таму купацца стаў рана, а ныраў дык проста ўсюды, дзе была вада. Бывала, што часам далонямі альбо тварам дакранаўся да дна, але нават гэта не спыняла мяне, а толькі набліжала да бяды. Вось і ў той чэрвеньскі дзень можна было проста пакупацца, абысціся без нырання. На жаль і на жах звычка ўзяла сваё: я даў нырца і галавой стукнуўся ў дно рэчкі.

Пашчасціла — мяне выцягнулі, праўда, з цяжкімі траўмамі ў шыйным і грудным аддзелах пазваночніка... Іншымі словамі, спатрэбілася некалькі імгненняў для таго, каб зламалася маё жыццё. Я стаў інвалідам, а гэта вялікая трагедыя, прычым не аднаго чалавека, а ўсёй яго сям'і.

...Сёлета вельмі рана адкрыўся купальны сезон, і статыстыка сумная. Ад спякоты людзі ратуюцца тым, што натоўпамі кіруюць да рэк і вадаёмаў. Там можна акунуцца ў прахалодную ваду, там, на беразе, многія, што называецца, «накрываюць паляны», адпачываюць, выпіваюць, даюць волю сваім пачуццям: думаюць, што нырнуць — гэта вельмі проста. Але ж не дай бог нікому вынырнуць з такімі траўмамі, як у мяне.

Валерый Васілеўскі, *г/п Глуск.*

Смех смехам

ДЗЕД І БАБА

Некалі мне шчасціла гасцяваць на Палессі. З тых часоў — найлепшыя ўспаміны...

Раніцай выходжу на вуліцу. Насустрач — растрывожаны гаспадар.

— Што зрабілася? — пытаюся ў яго.

— Ды ноччу, — кажа, — ледзь не памёр!

— ?!

— Тэмпература была 37,2!

☺ ☺ ☺

Гаспадыня раненька напякла бліноў, пайшла даглядаць гаспадарку.

— Нешта забавілася? — непакоюся я.

— Дык яна ж да Сцёпкі пайшла — парацца, — тлумачыць гаспадар.

Тым часам прайшла гадзіна...

— І што ў таго Сцёпкі можна пароць? — пытаюся я, і ўсе дружна смяюцца.

...Аказалася, што гаспадыня перабірае бульбу ў летняй кухні, якая тут называецца сцёпкай.

Наталля Сівак,
в. Заполле, Чэрвеньскі раён.

Фота з канверта



Фота Анастасіі ГПАЦЬЕВАЙ.

Да 75-годдзя ВЫЗВАЛЕННЯ 1944 2019

Імя салдата

Аляксей Ганчарэнка вярнуўся з баявога задання

Пошукавікі цяпер дакладна ведаюць, дзе загінуў стралок-радыст бамбардзіроўшчыка Іл-4

...У той дзень з ваеннага аэрадрома каля сяла Адуева Смаленскай (сёння Калужскай) вобласці ў неба падняліся 20 бамбардзіроўшчыкаў. Ішоў трэці год вайны, і савецкія лётчыкі ляцелі бамбіць буйны нямецкі аэрадром у раёне Балбасава, што ў Аршанскім раёне. На жаль, не ўсім выпала вярнуцца з таго баявога задання. Увесь пасляваенны час лічылася, што экіпаж самалёта Іл-4 прапаў без вестак. Але чатыры гады таму байцы абласнога гісторыка-патрыятычнага клуба «Віккру» выйшлі, як той казаў, на след. На днях большая частка дэталяў і фрагментаў бамбардзіроўшчыка была паднятая на паверхню.

Ваенная гісторыя

Летась падчас разведкі пошукавікі канчаткова вызначыліся з месцам, дзе быў збіты самалёт. Сярод тых, хто адправіўся ў экспедыцыю, знаходзіўся і карэспандэнт «Звязды». З месца падзей быў зроблены рэпартаж пра тое, як самаадбыўна працуюць «віккруўцы» ў пошуках згінулых герояў вайны. Яшчэ тады было зразумела, што бамбардзіроўшчык разляцеўся на часткі — яго дэталі знаходзіліся на даволі вялікай адлегласці адна ад адной. Але што гэта за самалёт і што стала з яго экіпажам, дакладна не ведаў ніхто. Былі аповеды мясцовых з эмацыянальнай афарбоўкай. Сын аднаго з відавочцаў — Аляксандр Заблоцкі расказаў пра тое, як яго бацька знайшоў у лесе штурмана гэтага бамбардзіроўшчыка і прывёў да сябе дамоў. Лётчык быў паранены, і сям'я з вялікай пагрозай для сваёй бяспекі пэўны час лячыла яго. Пасля вайны былы штурман прыехаў у вёску, каб асабіста падзякаваць выратавальніку. Сустрэча атрымалася вельмі хвалюючая. Паслухаць госця, які цудам пазбегнуў смерці і жывы вярнуўся з вайны, збеглася ўся вёска. Менавіта тады лётчык назваў імёны сваіх баявых таварышаў, якіх — аднаго ў паветры, а другога ўжо на зямлі — расстралялі немцы. На той час вяскоўцы тайком пахавалі іх на ўскрайку сяла. Адзіны, хто застаўся ў збітым самалёце, стралок-радыст Аляксей Ганчарэнка. Гэта было адзінае імя, пра якое ведалі жыхары. Пры спробе дастаць тое, што засталося ад самалёта, яны яшчэ тады, у 43-м, выцягнулі з балотнай твані пасведчанне на імя Ганчарэнкі разам з кавалкам тканіны. Яшчэ летась пошукавікі не маглі сказаць са стапрацэнтнай упэўненасцю, ці быў гэта той самы самалёт, пра які расказаў Заблоцкі. У клічаўскіх лясах у раёне вёскі Рагі гэта не адзіны бамбардзіроўшчык, які з часоў вайны ляжыць у зямлі. Цяпер дакладна вядома — гэта ён.

Самалёт выходзіць на паверхню

Збіраючыся ў чарговую экспедыцыю, пошукавікі ўзялі з сабой на дапамогу навучэнцаў Клічаўскага дзяржаўнага аграрна-тэхнічнага каледжа. Баявая машына ляжала на глыбіні да чатырох метраў, і трэба было добра папрацаваць, каб яе дастаць. Маладых хлопцаў запрасілі таму, што вось такія ўрокі мужнасці засвойваюцца хутчэй, чым любая інфармацыя ў вучэбнай аўдыторыі. Калі ўгрызаешся ў зямлю, кавалкам за кавалкам адваёўваючы ў пражэрлівай вайны парэшткі, а калі пашчасціць, то і імёны тых, каго яна не жадае вяртаць, зусім па-іншаму пачынаеш разумець той страшны перыяд гісторыі. А гэтым хлопцам, будучым работнікам сельскай гаспадаркі, яшчэ і карысна ведаць, што ў зямлі, на якой спее збожжа і квітнее канюшына, вельмі часта можна сустрэць такія вось стыхійныя пахаванні. І трэба ведаць, як на гэта рэагаваць.

У лесе разгарнуцца перашкаджаюць абмежаваная прастора і рой крыважэрных насякомых, якім усё адно, чым тут займаецца чалавек — шукае суніцы або аднаўляе шматгадовую неспраўвядлівасць. Байцы клуба «Віккру» — хлопцы трывалыя, загартаваныя ў шматлікіх экспедыцыях і паходах. Яны не рэагуюць ні на насякомых, ні на спякоту, ні на якія іншыя знешнія раздражняльнікі. Справе дапамагае тэхніка мясцовай ПМК. Але ж усе тоны зямлі трэба перапрацаваць і прапусціць праз спрактыкаваныя да гэтага рукі. Яны ніколі не перабольтаюць нікчэмную жалезку з важнай знаходкай.

Пад'ём бамбардзіроўшчыка Іл-4 працягваўся тры дні. Увесь гэты час пошукавікі працавалі амаль бязвылазна. Сабралі, страшна падумаць, паўмашыны розных дэталяў і фрагментаў. Галоўную нумарную дэталь ад самалёта «запеленгаваў» вопытны баец клуба Юрый Кармазін. Некалькі важных дэталяў знайшоў Ілья Трыханаў. У пошукавым клубе ён яшчэ з часоў вучобы ў Беларуска-Расійскім універсітэце. Паўгода таму адслужыў у арміі і зноў вярнуўся ў строй. Віталь Масольд, яшчэ адзін актыўны пошукавік, вывучыў за апошні перыяд, здаецца, усю начынку самалёта. Ён упэўнена даваў апісанне дэталяў і выдзяляў, што важна, а што ніякага інтарэсу не ўяўляе. Пад'ём самалёта стаў баявым хрышчэннем для Дзяніса Хітрыкава, аднаго з навучэнцаў Клічаўскага аграрна-тэхнічнага каледжа. Хлопец працаваў амаль без перапынку, нават на абед. «Наш чалавек», — сходу даў яму характарыстыку галоўны пошукавік Мікалай Барысенка. І паабяцаў, што хутка хлопец будзе прыняты ў пошукавае брацтва. А ён ужо марыць, як адправіцца з вопытнымі калегамі на пошукі яшчэ аднаго «клічаўскага самалёта», пра які яму расказваў бацька.

— З сотняў дэталяў знойдзены дзве галоўныя — з нумарамі рухавіка, — адзначае Мікалай Барысенка . — У выніку гэтага ўдалося высветліць мадэль і нумар самалёта, баявое заданне, экіпаж, часць, дзе служылі лётчыкі. Гэта 17-ы гвардзейскі Рослаўльскі бамбардзіровачны авіяполк. У самалёце знаходзіліся камандзір экіпажа Юрый Кралявец з сяла Палтаўка Омскай вобласці, штурман Уладзімір Нікіфараў з Чаркас, паветраны стралок Павел Перасянчук з сяла Паўлаўка Вінніцкай вобласці і паветраны стралок-радыст Аляксей Ганчарэнка з горада Трасцянец Сумскай вобласці. На жаль, Аляксея мы так і не знайшлі, хоць ён павінен быць на месцы падзення. З каштоўных знаходак таксама фрагмент прыцэла для бомбакідання, частка крыла і іншыя дробязі. Самалёт разваліўся яшчэ ў паветры. Мы яго збіралі па частках на плошчы каля ста квадратных метраў.

Гэта трэба не мёртвым...

Паважаныя байцы клуба «Віккру», дзякуй вам за ўедлівасць, апантанасць, настойлівасць. Без вас не было б вось гэтых вернутых з небыцця імёнаў, шчаслівых слёз нашчадкаў тых, хто не вярнуўся з вайны. Бо для роду не існуе пачуцця часу ў сваім жаданні знайсці блізкага чалавека і пакланіцца яго праху. Пакаленні змяняюцца, а боль страты не праходзіць. Гэта, напэўна, перадаецца на генным узроўні. Зусім нядаўна пісала аб тым, што ў Слаўгарадскім раёне знайшлі астанкі радавога Нурмухамеда Магдзеева, ураджэнца Кзылардзінскай вобласці. Яго пляменнік Хаміт Магдзееў прыляцеў на месца раскопак, як толькі даведаўся, што яго дзядзька знойдзены. А на мінулым тыдні, калі другі раз была ў гэтым раёне, мне расказалі, што Хаміт зноў прыязджаў, каб разам з пошукавікамі і музейнымі работнікамі яшчэ раз аднавіць падзеі тых страшных ваенных дзён і таго бою, з якога не вярнуўся яго продак.

Вось і гэтым разам, не паспела інфармацыя пра самалёт абляцець сайты, як з кіраўніком гісторыка-патрыятычнага клуба «Віккру» звязалася ўнучатая пляменніца стралка-радыста Аляксея Ганчарэнкі. «Мікалай Сяргеевіч, добры дзень, — піша яна. — Са мной звязаўся Сяргей і падказаў ваш электронны адрас. Справа ў тым, што Аляксей Ганчарэнка — гэта дзядзька маёй бабулі. Я займаюся яго пошукам і тут даведваюся, што знайшлі месца, дзе ён разбіўся і яго астанкі да гэтага часу знаходзяцца пад зямлёй. Вось гэта быў сюрпрыз! Сваякоў, якіх я ведаю і якія маюць да гэтага дачыненне, я апавяшчу са свайго боку. Нам гэта цікава! Прыкладзём намаганні, каб пабываць на месцы. Калі не цяжка, трымайце нас у курсе. Буду вельмі вам удзячная!!! Дзякуй вам за працу, якую вы робіце і тым людзям, якія ўваходзяць у такія атрады! З павагай Карына Баўкова».

— Адкуль гэта Карына, я не ведаю, бо толькі атрымаў ліст і яшчэ не паспеў спісацца, — кажа Мікалай Барысенка. — Яна спасылаецца на нейкага Сяргея, але і гэтае імя мне нічога не гаворыць. А вось напісанае вельмі кранула. Дзеля гэтага мы і працуем. Месца падзення самалёта будзе ўвекавечана. Зараз мы вядзём пошук родных астатніх лётчыкаў. Усім гэтым хлопцам, калі яны загінулі, было крыху болей за 20 гадоў. Па нашых звестках іх дома чакалі бацькі, свае сем'і яны яшчэ не паспелі стварыць. Тое, як адрэагавала на паведамленне Карына, сведчыць, што лётчыкі дагэтуль лічацца зніклымі без вестак. Мы ім дапамаглі вярнуцца з небыцця.

Дарэчы, па нямецкіх дакументах дакладна ўстаноўлена, калі і хто збіў у 43-м савецкі бамбардзіроўшчык. Усё адбылося а палове дванаццатай у ноч з 13 на 14 кастрычніка на вышыні 4200 метраў. За штурвалам «месера» сядзеў лётчык нямецкай эскадрыллі «Начныя знішчальнікі» капітан Алоіс Лехнер. Але праз год, у лютым 44-га, у той жа Магілёўскай вобласці яго «юнкерс» трапіў на прыцэл савецкай «зеніткі» і быў абясшкоджаны. Сам лётчык з цяжкімі раненнямі ўзяты ў палон. Што з ім пасля гэтага адбылося, гісторыя замоўчвае. У нямецкіх спісках ён дагэтуль лічыцца зніклым без вестак. Гэтай інфармацыяй з магілёўскімі пошукавікамі падзяліліся іх расійскія калегі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота Святланы БАРЫСЕНКІ.

У тэму

На сённяшні дзень вядома, што як мінімум тры бамбардзіроўшчыкі аднаго і таго ж 17-га гвардзейскага Рослаўльскага бамбардзіровачнага авіяпалка былі збіты над Клічаўскім раёнам. У 2015 годзе адзін з самалётаў Іл-4 быў падняты байцамі клуба «Віккру» і па яго нумарных дэталях устаноўлены імёны лётчыкаў. На месцы яго падзення каля пасёлка Мяжное паставілі памятны знак. Яшчэ адзін Іл-4, як мяркуюць пошукавікі, знаходзіцца ў зямлі непадалёк ад вёскі Ворліна. Падчас разведкі тут былі знойдзены дэталі самалёта, якія па афарбоўцы і форме можна аднесці да лятаючага танка — так называлі паміж сабой гэту баявую машыну лётчыкі.

Віктар БУБЯНЦОЎ, намеснік начальніка ўпраўлення ідэалагічнай работы галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама:

— Гэтая пошукавая экспедыцыя і ўрачыстае перапахаванне астанкаў герояў, паднятых каля вёскі Гаі Магілёўскага раёна, якое адбудзецца на гэтым тыдні, прымеркаваны да акцыі «Беларусь памятае». На вышыні Уладзіміра вечны спакой знойдуць астанкі 22 чырвонаармейцаў. Яшчэ аднаго героя, які аказаўся міліцыянерам і яго імя было ўстаноўлена, урачыста пахаваюць на яго радзіме ў Клімавіцкім раёне. Работа, якая праводзіцца магілёўскімі пошукавікамі, неацэнная. Трэба, каб маладое пакаленне ведала, якой цаной дасталася нам гэтая Перамога. Дарэчы, сёлета мы адзначаем таксама дзве юбілейныя даты, звязаныя з вайной і ўвекавечаннем памяці загінулых. Са дня заснавання клуба «Віккру» спаўняецца 25 гадоў, а Магілёў у чэрвені адзначыць 75-годдзе са дня свайго вызвалення.

ЗААЗЕРСКІЯ ЧАЎНЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На сядзібе Вільчынскага стаіць новая лодка — пракапачаная, прапітаная адмысловым растворам, прасмоленая. Раз-пораз гаспадар залівае ў лодку ваду, каб не рассыхалася пад гарачым летнім сонцам, бо хутка прыедзе рыбак (гэта ён замовіў лодку), павязе гэтае судна на возера, а лодка не павінна даваць цечы. А побач — штабель абпілаваных дошак і збітыя какоры — «паўфабрыкаты» на чарговую лодку.

— Звычайна падрыхтоўка матэрыялаў на будоўлю лодкі цягнецца два-тры дні, але сам працэс зборкі займае ўсяго толькі пару гадзін, — кажа Уладзімір перад пачаткам работы. — І ўсё гэта дзякуючы сучасным прыстасаванням, асабліва бензапіле.

Уладзімір не хавае сваёй тэхналогіі ад людзей, ён прапанаваў мне паназіраць за працэсам нараджэння новай лодкі. Спачатку на зямлю кладуцца пяць дошак, іх збіваюць паміж сабою какорамі і абразаюць — робяць контуры днішча. Уладзімір спрытна арудуе малатком, звонка падае голас піла, яму дапамагае падручны Аляксандр Чарняўскі. Работа ідзе бойка, бо кожны ведае сваю справу. Пятнаццаць хвілін — і дно гатова. Прыладжваюцца карма і нос, эліпсам выгінаюцца і прыбіваюцца бартавыя дошкі...

На ліку майстра ўжо дзясяткі лодак, зробленых па сваёй тэхналогіі, але сучасным інструментам. Сваю першую лодку Вільчынскі збіў пры дапамозе звычайнай сякеры яшчэ ў 1987 годзе. Яго настаўнікам быў лодачны майстар з Сянна дзядуля Аляксандр Альхіменка. Азёрныя лодкі могуць выглядаць па-рознаму, але менавіта дзедаўская школа легла ў аснову стылю заазерскага майстра, і ён яе не мяняе.

Прайшло гадзіны паўтары-дзве, і на падворку майстра з'явілася яшчэ адна навяспечаная лодка. У вольны час гаспадар будзе канапаціць швы і зазоры, растопіць смалу, залье ўсе шчыліны. А каб не рассыхалася — напоўніць вадою. Будзе габляваць вёслы. Пазней, калі аб'явіцца новы гаспадар, у лодкі з'явіцца свой рэгістрацыйны нумар — і яшчэ адно возера будзе калыхаць прыгожую і надзейную заазерскую пласкадонку.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Больш здымкаў і відэа глядзіце на нашым сайце.

Спытайце пра радзіннае

На каго палюе русалка?

«Прыйшло лета, спякота, і мы ўсё часцей і часцей ідзём на рэчку, што працякае за вёскай. Міжволі згадваецца, як у дзяцінстве бабулі расказвалі пра русалак, якія могуць заказытаць тых, хто парушае іх прастору», — разважае-распавядае наша чытачка Марына з вёскі Забалацце Мінскай вобласці і цікавіцца, адкуль з'явіліся гэтыя персанажы ў нашай міфалогіі.

Часцей за ўсё навукоўцы сыходзяцца на думцы, што паводле народных уяўленняў русалкі — гэта жанчыны і дзеці, якія памёрлі не сваёй смерцю. У народзе такіх нябожчыкаў называюць закладнымі (руск. заложными), «нячыстымі нябожчыкамі»: дзяўчаты, памёрлыя да шлюбу, тапельніцы, дзеці, памёрлыя да хрышчэння, «заспаныя дзеці» і некаторыя іншыя — звычайна закладныя нябожчыкі.

Знайшлося гэтым персанажам месца і ў рытуальна-абрадавым комплексе традыцыйнага календара — Русальны тыдзень, які пачынаўся ў панядзелак пасля Тройцы. Па ступені патрабавальнасці рэгламентацый ён стаяў у адным шэрагу з Калядамі, Масленіцай і Велікодным тыднем і даволі рэзка абмяжоўваў прастору чалавечай дзейнасці, фактычна звужаючы яе да межаў сядзібы і вёскі. Усё астатняе наваколле, без выключэнняў, на гэты час лічылася надзвычай небяспечным і крайне непажаданым ні для якой дзейнасці. І канешне ж, зусім недапушчальным лічылася пранікненне чалавека ў тыя локусы, якія на святочны час станавіліся месцам русалчыных гулянняў, — рака, лес, поле. Вось што на гэты конт кажуць народныя вераванні і сведчанні носьбітаў традыцыі. У Беларусі існавала павер'е пра тое, што ў гэты час нельга хадзіць у лес і нарыхтоўваць дровы: русалка выхапіць сякеру і выпусціць дух з таго, хто асмеліўся парушыць векавечнае табу. На Гродзеншчыне бытавала забарона хадзіць на Русальным тыдні ў поле, глядзець жыта або рваць кветкі, а таксама купацца ў тым месцы, дзе калісьці ўтапіўся чалавек.

Святочны час адрозніваўся ад будзённага значным абмежаваннем традыцыйнага кола заняткаў. Пры гэтым ствараецца ўражанне, быццам у час свят дзейнічалі дзве паралельныя сістэмы рэгламентацый. Адна з іх — тая, што ахоплівае правілы, якія дзейнічаюць пастаянна (на працягу ўсяго года), такія як забарона ткаць або прасці ў пятніцу, другая — святочная, якая адначасова захоўвала паўсядзённыя правілы сацыяльных стасункаў і дадаткова прадпісвала ўвядзенне часовых, святочных забарон. Якраз падвоены статус забарон і вымагаў жорсткага пакарання іх парушальнікаў.

На Русальным тыдні забаранялася шыць («щоб русалци очей не зашить»), не хадзілі ў гарод капаць і акучваць, бо там усюды будзе русалка, не падмазвалі печ і сцены хаты, «щоб русалкам очи не забризгаць глинаю».

Асобныя крыніцы сведчаць, што русалка не толькі служыла вадзяніку, але і сама здольна была натварыць бяды: «На бераг русалкі выходзяць рэдка, а калі і вылазяць, то далёка ад вады не адыходзяць. Яны заманьваюць да сябе падарожных мужчын, якія больш за ўсё прывабліваюцца прыгажосцю, і стараюцца заказытаць. Ад няма чаго рабіць русалкі смяюцца з рыбакоў: блытаюць іх сеткі, выцягваюць нерат на бераг». Беларускія этнографы яшчэ больш пашыраюць кола адмоўных і станоўчых учынкаў русалак. Паводле павер'яў, русалка выварочвала сеткі, набівала іх цінай, вырывала вёслы, тапіла людзей у рэках і азёрах, затрымлівала жывёлу ў лесе і разам з тым вартавала жыта, калі яно каласілася, сачыла, каб ніхто не ламаў каласоў, не атрасаў з іх расу.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Дасылайце свае пытанні пра карані і прыстасаванасць да сучаснага жыцця каляндарных і сямейна-побытавых народных традыцый і абрадаў на пштовы або электронны адрас рэдакцыі з пазнакай «Пра радзіннае».

Извещение о проведении аукциона по передаче земельного участка в частную собственность
организатор аукциона – Березинский районный исполнительный комитет

Лот №	Местоположение земельного участка, кадастровый номер	Площадь земельного участка, га	Назначение земельного участка	Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона	Начальная цена земельного участка, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
1	Минская область, г. Березино, ул. Максима Танка, 6 620450100001000012	0,1500	Для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома)	– внесение платы (части платы – в случае предоставления в установленном порядке рассрочки ее внесения) за земельный участок; – **возмещение затрат**: расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ будут определены на основании счета-фактуры; – осуществление победителем аукциона либо единственным участником не состоявшегося аукциона в двухмесячный срок государственной регистрации права на земельный участок; – получение победителем аукциона либо единственным участником не состоявшегося аукциона в течение одного месяца после осуществления государственной регистрации права на земельный участок разрешения на проведение проектно-изыскательских работ для строительства; – занятие земельного участка не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство данного объекта; – возмещение затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку победителем аукциона не производится	5563,86	556,38

1. **Аукцион состоится 19 июля 2019 года в 10.00 в малом зале заседаний Березинского райисполкома по адресу: г. Березино, ул. Октябрьская, 18.**

2. **Заявления** на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **принимаются** ежедневно в рабочие дни по адресу: г. Березино, ул. Октябрьская, 39 отделом землеустройства Березинского РИК с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, **до 16.00 16.07.2019 года.** Также для участия в аукционе необходимо представить документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключить с Березинским райисполкомом или по его поручению с организацией соглашение.

3. Кроме того, в комиссию или организацию представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования.

При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют документ, удостоверяющий личность.

4. **Сумма задатка перечисляется на р/с BY88AKBB36006110002020000000, ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, AKBBBY2X, получатель – ГУ МФ РБ по Минской обл., код платежа – 04901.**

5. Аукцион признается несостоявшимся или нерезультативным, если заявление на участие в нем подано только одним участником, или для участия в аукционе не было подано ни одного заявления, или на аукцион явился один из участников, или ни один из участников не явился на аукцион. Не допускаются начало торгов и продажа предмета аукциона по начальной цене.

